Чалавек і свет, 5 клас

# Т2. Целы, рэчывы, з'явы

## Ур.6/1 Целы і рэчывы. Малекулы

*Мэта:* пазнаёміцца з паняццямі "цела", "рэчыва", "малекула"; падрыхтавацца да знаёмства з прыроднымі з'явамі; праверыць узровень ведаў па тэме "Космас і Зямля".

*Развіццё:* навыкі чытання і аналізу прачытанага кніжнага тэксту; уменне выконваць абагульненне падчас самастойнай працы.

*Выхаванне:* усталяванне добразычлівых стасункаў настаўніка і вучняў; адказныя адносіны да вынікаў сваёй вучобы; беражлівае стаўленне да свайго здароўя і школьнай маёмасці; аб'ектыўнасць існавання матэрыі.

I. Арганізацыйна-матывацыйная частка.

1. Арганізацыйныя пытанні.
   1) Вітанне з класам.
   2) Праверка гатоўнасці вучняў да ўрока. Вырашэнне магчымых праблем (напрыклад, са сшыткамі: калі вучань забыў сшытак, то падрыхтаваць лісточкі ў клетку, у якіх весці запісы на працягу ўрока, уверсе запісаць свае прозвішча і імя).
   3) Запіс у сшытках даты.
2. Размінка.
   1) Што называюць годам?
   2) Што называюць суткамі? Колькі гадзін яны доўжацца?
   3) Колькі сутак у годзе?
   4) Чаму на Зямлі адбываецца змена дня і ночы?
   5) Якія поры года змяняюцца на працягу года?
   6) *Чаму змяняюцца поры года?
3. Вынікі мінулага ўрока.
   1) Каментарый настаўнікам асноўных памылак, дапушчаных вучнямі ў самастойнай рабоце. Рэклама лепшых работ.
   2) Карэкцыя ведаў вучняў: адказы на пытанні, прагляд вынікаў РП (сшыткі былі вернуты вучням раней). *Пры гэтым можна выкарыстаць дапамогу вучняў, якія лепш справіліся з заданнямі. Напрыклад, можна даць ім права дадаваць да адзнакі вучня за выкананую ім РП 1..2 балы.*
   3) Выстаўленне адзнак у дзённікі вучняў.

II. Асноўная частка.

1. Пачатак вывучэння новай тэмы.
   1) Аб'яўленне і запіс у сшыткі назвы новай тэмы.
   2) Кароткая характарыстыка новай тэмы *(12 урокаў пра навакольны свет, прыродныя з'явы)*
   3) Тэма ўрока. ДЗ: §5, 6*. Аб праверачнай рабоцена гэтым уроку па папярэдняй тэме.
2. Знаёмства з новымі ведамі. *У залежнасці ад пачатковай падрыхтоўкі класа настаўнік або бярэ на сябе асноўную функцыю, або выкарыстоўвае працу з падручнікам і гутарку. Пры рабоце з падручнікам зручна тэкст чытаць і аналізаваць па абзацах. Пажадана выкарыстаць чытанне ўголас.*
   1) Целы і рэчывы (першыя два абзацы).
   2) З'явы прыроды (трэці абзац). ДЗ: праназіраць за з'явамі, аб якіх ішла гаворка.
   3) Малекулы (4, 5 і 6 абзацы). ДЗ: прачытаць дадатковы матэрыял (с.31) і падрыхтаваць адказы на пытанні да §5.
3. Праверачная работа.
   1) ФМ.
   2) Размеркаванне варыянтаў заданняў, інструктаж па правілах выканання работы.
   3) Выкананне вучнямі работы. Індывідуальная дыферэнцыраваная дапамога настаўніка.

III. Фінальная частка.

1. Заканчэнне ПР.
   1) Збор вынікаў ПР.
   2) Папярэднія вынікі ПР.
   3) Аб самакарэкцыі ведаў вучнямі (РП).
2. Аб тэме і змесце наступнага ўрока.
3. Заканчэнне ўрока. Развітанне настаўніка з класам.

09.10.2007 г. Сасімовіч І.Я.

Варыянт 1

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня цёмным колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У якую пару года цені ад прадметаў становяцца самымі доўгімі?”
*а) зіма; б) вясна; в) лета; г) восень.*
3. Выберыце і запішыце назвы сузор’яў: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра, Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць сузор’ямі?
4. Запішыце назвы нябесных цел, якія размешчаны бліжэй да Зямлі: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся старэючы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 2

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня светлым колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У які час сутак цені ад прадметаў становяцца самымі кароткімі?”
*а) поўнач; б) раніца; в) поўдзень; г) вечар.*
3. Выберыце і запішыце назвы зорак: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра , Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць зоркамі?
4. Запішыце назвы двух нябесных цел, паміж якімі размешчана Зямля: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся растучы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 1

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня цёмным колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У якую пару года цені ад прадметаў становяцца самымі доўгімі?”
*а) зіма; б) вясна; в) лета; г) восень.*
3. Выберыце і запішыце назвы сузор’яў: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра, Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць сузор’ямі?
4. Запішыце назвы нябесных цел, якія размешчаны бліжэй да Зямлі: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся старэючы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 2

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня светлым колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У які час сутак цені ад прадметаў становяцца самымі кароткімі?”
*а) поўнач; б) раніца; в) поўдзень; г) вечар.*
3. Выберыце і запішыце назвы зорак: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра , Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць зоркамі?
4. Запішыце назвы двух нябесных цел, паміж якімі размешчана Зямля: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся растучы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 1

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня цёмным колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У якую пару года цені ад прадметаў становяцца самымі доўгімі?”
*а) зіма; б) вясна; в) лета; г) восень.*
3. Выберыце і запішыце назвы сузор’яў: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра, Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць сузор’ямі?
4. Запішыце назвы нябесных цел, якія размешчаны бліжэй да Зямлі: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся старэючы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 2

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня светлым колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У які час сутак цені ад прадметаў становяцца самымі кароткімі?”
*а) поўнач; б) раніца; в) поўдзень; г) вечар.*
3. Выберыце і запішыце назвы зорак: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра , Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць зоркамі?
4. Запішыце назвы двух нябесных цел, паміж якімі размешчана Зямля: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся растучы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 1

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня цёмным колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У якую пару года цені ад прадметаў становяцца самымі доўгімі?”
*а) зіма; б) вясна; в) лета; г) восень.*
3. Выберыце і запішыце назвы сузор’яў: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра, Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць сузор’ямі?
4. Запішыце назвы нябесных цел, якія размешчаны бліжэй да Зямлі: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся старэючы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?

Варыянт 2

1. Якія паўшар’і Зямлі паказаны 22 снежня і 22 чэрвеня светлым колерам: летнія ці зімнія? Чаму вы так думаеце?



22 снежня 22 чэрвеня

2. Выберыце правільны варыянт адказу на пытанне: “У які час сутак цені ад прадметаў становяцца самымі кароткімі?”
*а) поўнач; б) раніца; в) поўдзень; г) вечар.*
3. Выберыце і запішыце назвы зорак: *Арыён, Месяц, Юпітэр, Ліра , Вега, Сірыус, Сонца, Касіяпея.* Што называюць зоркамі?
4. Запішыце назвы двух нябесных цел, паміж якімі размешчана Зямля: *Сонца, Месяц, Марс, Венера, Меркурый, Вега, Юпітэр.*
5. Нарысуйце круг. Замалюйце яго частку так, каб атрымаўся растучы Месяц. Чаму змяняецца выгляд Месяца?